# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ГАЗЕТА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

ГАЗЕТА УЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

29 ЛЮТАГА 1996 года чацвер

№4 (1740)


*Чалавек першай паласы*

## "Я, напэўна, зноў пайшоў бы па журналісцкаму шляху"



***Не адно пакаленне студэнтаў журфака, а зараз масцітых і вядомых журналістаў, узгадвае Барыса Васільевіча Стральцова самым добрым словам. Таленавіты публіцыст, журналіст з паўвекавым творчым стажам, член Саюза журналістаў, лаўрэат прэміі Саюза журналістаў, доктар філалагічных навук, прафесар кафедры тэорыі і практыкі сучаснай журналістыкі, 1сакавіка ён святкуе сваё 70-годдзе. З нагоды юбілея супрацоўніца рэдакцыі "Беларускага універсітэта" сустрэлася з ім.***

**— Барыс Васільевіч, скажыце, калі б час можна было вярнуць назад, ці выбралі б Вы зноў прафесію журналіста?**

— Ведаеце, журналісцкая прафесія — гэта бесперапынны інфармацыйны працэс, які патрабуе ад цябе заўсёды быць у рэчышчы праблем. Бываюць такія моманты, калі здаецца, што — усё, спісаўся... А мінае час — і табе зноў нечага не хапае, зноў цягне за стол, зноў хочацца нешта пісаць. Складана сказаць, але думаю, калі прадставілася б магчымасць, я, напэўна, зноў пайшоў бы па журналісцкаму шляху. Увогуле можна сказаць, што гэта адбылося неяк выпадкова. Першы рэпартаж напісаў яшчэ ў 1946 годзе, калі служыў у войску. Пазней, калі дэмабілізаваўся, працягваў супрацоўнічаць з газетамі. І захапіўся, але па газетах не бегаў: да універсітэта працаваў у бабруйскай абласной газеце, "Чырвонай змене" і "Звяздзе".

**— А зараз настальгія па працы ў газеце не мучае?**

— Я і зараз увесь час штонебудзь пішу і пастаянна хаджу ў рэдакцыі. Але працаваць, як раней, у газеце я, канешне ж, не стану — гады... Газета патрабуе энергіі, апэратыўнасці. Дарэчы сказаць, мае былыя студэнты ўжо даўно сышлі наперад ад мяне: дзе толькі не працуюць нашыя выпускнікі! Аднак адносіны ў нас з імі застаюцца самыя найцудоўныя.

**— Барыс Васільевіч, ці адрозніваецца цяперашняе пакаленне ад таго, што было, скажам, дзесяць год таму?**

— Цяжка абвінавачваць сённяшнюю моладзь. У "беспределе", які творыцца зараз, студэнты мала ў чым вінаватыя. Адзначце, у цяперашніх умовах расслаення грамадства нават сярэдняе пакаленне ў большасці сваёй адмаўляецца ад ранейшых ідэалаў. А што ж можна патрабаваць ад маладых? Яны ў гэтым беспарадку абсалютна страцілі арыенціры. Калі раней студэнты ведалі, куды ідуць і што іх чакае наперадзе (былі ўпэўненыя, што па меншай меры раённая газета ім забяспечаная), то сёння студэнты яшчэ ў час навучання ва універсітэце шукаюць, шукаюць самі часта нават не сваю нішу ў журналісцкім асяродку, а недзе яшчэ. Аднак усяляк праяўляюць ініцыятыву.

**— Гэта неяк адбіваецца на прафесійным узроўні журналістыкі?**

— Так, у творчым сэнсе прафесійны ўзровень знізіўся. Бывала, калі бліз Дома Друку вывешваліся ўсе газеты, вакол іх збіралася мноства журналістаў, чыталі, абмяркоўвалі... Глядзіш, як добры матэрыял (няхай і не твой) карыстаецца інтарэсам — так прыемна становіцца, велізарнае пачуццё гонару за калегу адчуваеш! Журналіст — гэта ж не толькі індывідуальная творчасць, але і калектыўная праца. А зараз гэта пачуццё калектывізму знікае, як і журналісцкая патрабавальнасць да сябе. А самакантроль, самавыражэнне і гонар павінны быць у журналіста ў першую чаргу.

У плане творчасці цяперашнія студэнты моцна адрозніваюцца ад ранейшых: няма накіраванасці, жадання працаваць над сур'ёзнымі аналітычнымі матэрыяламі, яны аддаюць перавагу рэкламе і інфармацыйным жанрам. Магчыма, тут праяўляюцца чыста спажывальніцкія адносіны? Але абвінавачваць у гэтым моладзь у цяперашніх умовах цяжка. Стан няпэўнасці ўласцівы ўсяму нашаму жыццю.

**— Барыс Васільевіч, Вашы творчыя планы...**

— Я паціху працую, падтрымліваю сувязь з рэдакцыямі. Вось нядаўна апублікаваў матэрыял у "Рэспубліцы", падрыхтаваў матэрыял для "Беларускай нівы". Што датычыцца літаратурнай працы, то рабіць нешта буйное і глыбокае практычна бессэнсоўна. Ні падручнікі, ні манаграфіі, ні мастацкую прозу выдавецтвы друкаваць не хочуць — стратная гэта справа. А калі рукапіс падручніка па журналістыцы, да прыкладу, праляжыць 2-3 гады, то яго, яшчэ не пабачыўшы свет, ужо трэба мяняць. Бо журналістыка — навука, якая пастаянна рухаецца, мяняецца, патрабуе далаўнення. Я вось распрацаваў брашуры "Дэмакратыя", "Мараль", "Права", своечасова іх не выдалі, а цяпер ідэалы мяняюцца. Каб не працаваць у стол, пішу невялікія апавяданні. Два апошніх хутка будуць надрукаваныя ў "Звяздзе" і "Чырвонай змене".

**— Што ж, Барыс Васільевіч, моцнага Вам здароўя і творчых поспехаў! Віншуем Вас з юбілеем! Дзякуй за размову.**

***Вольга Хадарэнка***

## "Бізнесмены заўтрашняга дня"

Беларускі саюз маладых прадпрымальнікаў (БСМП) плануе ажыццявіць праект "Бізнес-інкубатар", у выніку якога будзе створаны бясплатны кансультацыйны цэнтр па пытаннях эканомікі для бізнесменаўпачаткоўцаў.

БСМП — рэспубліканская маладзёжная грамадская арганізацыя па падтрымцы маладзёжнага бізнесу, мэта якой — скараціць існуючы разрыў паміж тэарэтычнымі ведамі і практычным вопытам і дапамагчы маладым людзям эканамічных спецыяльнасцей працаўладкавацца ў сферы маркетынгу, бухгалтарскага ўліку, банкаўскай справы, кіравання і фінансаў. На сённяшні дзень арганізацыя аб'ядноўвае 100 чалавек, большасць якіх — студэнты буйнейшых ВНУ эканамічнага профілю рэспублікі, у тым ліку і БДУ. Яны супрацоўнічаюць з Саюзам прадпрымальнікаў РБ, з Беларускім прадстаўніцтвам міжнароднай асацыяцыі студэнтаў-эканамістаў "AJESEC", наладжваюць сувязі з заходнімі калегамі. Так, паводле навучальнай праграмы БСМП на базе Беларускай дзяржаўнай політэхнічнай акадэміі нядаўна прайшоў семінар па праблемах малога бізнесу. Курс з 6 лекцый прачытаў па малому бізнесу з ЗША Чарльз Буба.

Сёння студэнты-эканамісты ствараюць банк даных, з дапамогай якога на аснове сваіх ведаў і валодання замежнай мовай лягчэй будзе знайсці працу, бо фірмы змогуць карыстацца гэтай інфармацыяй пры наборы патрэбных ім спецыялістаў. У бліжэйшы час маладыя прадпрымальнікі плануюць стварыць сваю фірму па оптава-рознічным гандлі прадуктамі харчавання.

Так што планаў шмат, і БСМП чакае ініцыятыўных людзей з ведамі ў галіне эканомікі і свежымі ідэямі.

***Святлана Шаблінская***



**Заўтра - вясна!**
**Віншуем жанчын са святам 8 сакавіка**

## Уладары жалеза

Калісьці кавальскія вырабы не былі чымсьці асаблівым. Амаль у кожнай вёсцы быў свой майстар.

Час змяніўся, і патрэбы ў нас цяпер трохі іншыя. Аднак заўсёды знаходзяцца тыя, хто дае забытым рамёствам новае жыццё. Адзін з гэтых людзей — Леанід Паўлавіч Назараў, дырэктар малога прадпрыемства "Мастацтва каваля".

— Мяне заўсёды цікавіла прафесія каваля,— гаворыць Леанід Паўлавіч,— але прыйсці да яе ўдалося не адразу: за штурвалам верталёта я мог толькі марыць аб гэтым. Пакінуўшы авіяцыю, я працаваў на металургічным заводзе ў Расіі, дзе і пераняў некаторыя сакрэты ручной коўкі ад старога майстра. На Беларусі нейкі час я працаваў у рэстаўрацыйнай брыгадзе, дапамагаючы аднаўляць гістарычныя помнікі. Знайшоў таленавітых сяброў, якія, дарэчы, і працуюць зараз са мною.

Невялічкая кузня месціцца ў арэндаваным памяшканні на ўскрайку горада. Зусім хутка майстры спадзяюцца пераехаць ва ўласную прафесійна абсталяваную кузню.

За чатыры гады сучасныя кавалі праславілі сябе далёка за межамі Беларусі. Іх цудоўныя падсвечнікі, камінныя наборы ўжо даўно цікавяць французаў і немцаў. А вось улюбёныя ў прыгажосць італьянцы павезлі да сябе нядаўна жалезную мэблю з адмыслова перапляценымі завіткамі.

Прагульваючыся па Мінску, звярніце калі-небудзь увагу на ўпрыгожванні кафедральнага сабора, жалезныя карункі Траецкага прадмесця або велічэзныя крыжы касцёла святых Сымона і Алены. Згадзіцеся, усё гэта створана рукамі сапраўдных уладароў жалеза.

***Аляксей Максюкоў***

*Выставы*

Наведаць адкрыты прагляд літаратуры па праграмаванню і вылічальнай тэхніцы запрасіў студэнтаў і выкладчыкаў БДУ 26 лютага аддзел абслугоўвання вучэбнай літаратурай бібліятэкі універсітэта. На выставе была прадстаўлена літаратура, выдадзеная ў розныя гады, аднак доўгі час проста не запатрабаваная ні студэнтамі, ні выкладчыкамі, якія пра яе існаванне не ведалі. Мэта выставы — прыцягнуць увагу да гэтых выданняў выкладчыкаў, даць магчымасць пазнаёміцца з імі студэнтам, а таксама прыцягнуць студэнтаў да карыстання літаратурай з фондаў бібліятэкі БДУ.

***К.Ткачэнка***

# Падарункі ад Гаспадыні Меднай гары

З 23 па 25 лютага ў Беларускай дзяржаўнай політэхнічнай акадэміі праходзіла V міжнародная мінералагічная выстава-кірмаш "Каменная казка".

Яшчэ здаўна было вядома пра таямнічую, цудадзейную сілу камню. Аметыст (ад грэч. amethystos не п'яны) лічыцца сродкам ад п'янства, агат абароніць ад падкопаў ворагаў, нефрыт — ад многіх хваробаў...

Усе ўзоры, прадстаўленыя на выставе, — натуральныя камяні. Наведвальнікі маглі набыць на ёй сувеніры, ювелірныя упрыгожванні, калекцыйныя экземпляры.

Самым пераборлівым прадставілася магчымасць зрабіць індывідуальны заказ.

Прадэманстраваць сваё майстэрства прыехалі ювеліры з Малдавіі, Украіны, Пецярбурга. Акрамя гэтага, прыборабудаўнічы факультэт БДПА, які ўжо другі год з'яўляецца галоўным арганізатарам выставы, прадставіў экспазіцыю абсталявання для ювелірнай прамысловасці.





# Монстры вакол нас

У апошні час Мінск літаральна перапаўняюць розныя выставы. І часам думаеш, якую з іх наведаць, каб не змарнаваць час і зберагчы кашалёк ад значнага пахудання.

Раз'язджаючы па Заходняй Еўропе, прадстаўнікі дацкай кампаніі United Exhibits вырашылі ашчаслівіць беларусаў сваёй фантастычнай экспазіцыяй "Монстры вакол нас". За кідкай назвай хаваецца вялізная калекцыя матылькоў і жукоў з усяго свету, каштоўнасць якой — больш за мільён долараў. Дапаўняюць збор некалькі насякомых, павялічаных у сотні разоў.

Нягледзячы на адсутнасць якіх-небудзь жахаў выстава вельмі цікавая, усюды яна мела шалёны поспех.

Вядзёны цікаўнасцю, я наведаў летнюю залу кінатэатра "Перамога" і выклаў 25 тысяч сваіх кроўных грошай. Па невялічкаму памяшканню хадзіла маладая пара з фотаапаратам (за гэта плата асобная), а потым, стаміўшыся, надоўга спынілася каля стойкі бара, пацягваючы "Сангрыю".

— Сэнс выставы, — сказаў адзін з прадстаўнікоў адміністрацыі — як мага глыбей пазнаёміць нашых дзяцей з цудоўным светам насякомых, паведаміць пра некаторыя сакрэты іх жыцця, прыстасаванасць да навакольнага асяроддзя.

Дарэчы, выстава прапануе 14 так званых "інтэрактыўных" атракцыёнаў, на якіх чалавек ператвараецца ў насякомае: паглядзіш у шкляное вока страказы ці мухі — і ты ўжо не чалавек. Дзіва, дый годзе!

Вялікія монстры, добра патрапаныя шматлікімі пераездамі, дарэмна спрабавалі са скрогатам рухацца — электроннае кіраванне на холадзе працуе дрэнна (я ўжо не кажу пра металічнага павука з пультам кіравання, які рашуча адмовіўся "рабіць з мяне насякомае").

Адно суцяшае: пасля выставы па карэньчыку білета можна бясплатна паглядзець у кінатэатры фільм.

Выстава працуе толькі да 31 сакавіка. Спяшайцеся!

***Аляксей Максюкоў***

_Гэта цікава_

# Хто ёсць хто

Большасць вядомых людзей па розных прычынах амаль усё жыццё пражылі пад псеўданімамі. Часта іх сапраўднае прозвішчы застаюцца для многіх невядомымі. Нагадаем некаторыя з іх.

**Ганна Ахматава** (руская паэтэса) — Ганна Андрэеўна Гарэнка;

**Дзям'ян Бедны** (рускі пісьменнік) — Яфім Аляксеевіч Прыдвораў;

**Андрэй Белы** (рускі пісьменнік) — Барыс Мікалаевіч Бугаеў;

**Змітрок Бядуля** (беларускі пісьменнік) — Самуіл Яфімавіч Плаўнік;

**Вальтэр** (французскі пісьменнік і філосаф) — Мары Франсуа Аруэ;

**Аляксандр Грын** (рускі пісьменнік) — Аляксандр Грынеўскі;

**Марлен Дзітрых** (амерыканская кінаактрыса) — Марыя Магдалена фон Лош;

**Ганна Зегерс** (нямецкая пісьменніца) — Нацці Радвані;

**І.Ільф, Я.Пятроў** (рускія пісьменнікі-сааўтары) — Ілья Арнольдавіч Файнзільберг, Яўген Пятровіч Катаеў;

**Веніямін Каверын** (рускі пісьменнік) — Веніямін Зільбер;

**Карандаш** (артыст цырка) — Міхаіл Румянцаў;

**Міхаіл Кальцоў** (рускі пісьменнік) — Міхаіл Фрыдлянд;

**Якуб Колас** (беларускі пісьменнік) — Канстанцін Міцкевіч;

**Янка Купала** (беларускі пісьменнік) — Іван Дамінікавіч Луцэвіч;

**Кукрыніксы** — агульны псеўданім трох рускіх графікаў: Міхаіла Купрыянава, Парфірыя Крылова, Мікалая Сакалова;

**Сафі Ларэн** (італьянская кінаактрыса) — Сафія Шыкалонe;

**Мальер** (французскі драматург) — Жан Батыст Паклен;

**Мэрылін Манро** (амерыканская кінаактрыса) — Норма Бейкер;

**Пабла Неруда** (чылійскі паэт) — Нафталі Рыкарда Рэйес Басуальта;

**О'Генры** (амерыканскі пісьменнік) — Уільям Сідні Портэр;

**Пеле** (бразільскі футбаліст) — Эдсан Аранціс ду Насіменту;

**Марына Уладзі** (французская кінаактрыса) — Марыя-Луіза Палякова-Байдарова.

# Палажэнне аб правах і абавязках старастаў паверхаў у інтэрнаце Белдзяржуніверсітэта

***І раздзел. Правы старасты паверха***

Стараста паверха ў інтэрнаце БДУ мае права:

1. Прадстаўляць інтарэсы студэнтаў, якія пражываюць на паверсе.

2. Уносіць прапановы дырэкцыі студгарадка, у аддзел па справах моладзі па паляпшэнню санітарна-бытавых умоваў пражывання ў інтэрнаце, а таксама аб накладанні санкцый за парушэнне "Правілаў унутранага распарадку" праз студэнцкі савет інтэрната.

3. Інфармаваць студсавет аб выяўленых парушэннях "Правілаў унутранага распарадку".

***ІІ раздзел. Абавязкі старасты паверха***

Стараста паверха ў інтэрнаце БДУ абавязаны:

1. Мець спіс студэнтаў, якія пражываюць на паверсе, унікаць у іх патрабаванні і праблемы, вывучаць інтарэсы, асаблівасці і схільнасці студэнтаў, ведаць іх матэрыяльнае і сямейнае становішча.

2. Сачыць за выкананнем студэнтамі, якія пражываюць на паверсе, "Правілаў унутранага распарадку".

3. Сачыць за захаванасцю мэблі, абсталявання, газавых і электрычных плітаў на паверсе.

4. Інфармаваць студсавет, выхавальніка і загадчыцу інтэрната аб парушэннях, якія адбыліся на паверсе.

5. Складаць графік прыборкі кухань на паверсе (пры неабходнасці — самім паверхаў) і сачыць за якасцю прыборкі.

6. Весці разам з адміністрацыяй інтэрната журнал санітарна-тэхнічнага стану жылых пакояў і месцаў агульнага карыстання (журнал знаходзіцца ў загадчыцы інтэрната. Праверка двойчы ў месяц).

7. Прымаць разам з адміністрацыяй інтэрната меры па ліквідацыі выяўленых заўваг.

***Падрыхтавана па рашэнню Савета БДУ аддзелам па справах моладзі***

# Палажэнне аб аператыўным атрадзе інтэрната Белдзяржуніверсітэта

***І раздзел. Агульныя палажэнні***

1. Оператрад інтэрната з'яўляецца органам самакіравання і выбіраецца з ліку найбольш актыўных жыхароў. Камандзір оператрада выбіраецца з ліку членаў оператрада і зацвярджаецца загадам па БДУ.

2. Оператрад ажыццяўляе сваю дзейнасць у адпаведнасці з заканадаўствам РБ, Палажэннем, супрацоўнічае са студсаветам інтэрната, аддзелам па справах моладзі, адміністрацыяй інтэрната і прафкамам студэнтаў.

***ІІ раздзел. Правы оператрада***

Оператрад інтэрната мае права:

1. Уносіць прапановы па кантролю за парадкам у час правядзення масавых мерапрыемстваў (час правядзення, дзяжурствы).

2. Кантраляваць правапарадак у інтэрнаце ў адпаведнасці з "Правіламі ўнутранага распарадку ў інтэрнаце БДУ".

3. Уносіць прапановы па пытаннях арганізацыі прапускной сістэмы.

***ІІІ раздзел. Абавязкі оператрада***

Оператрад арганізоўвае сваю работу ў адпаведнасці з рашэннямі адміністрацыі інтэрната і студсавета.

Оператрад інтэрната абавязаны:

1. Сачыць за выкананнем "Правілаў унутранага распарадку".

2. Арганізоўваць дзяжурствы кожны вечар на вахце з мэтай дапамогі ў арганізацыі прапускной сістэмы.

3. Інфармаваць выхавальнікаў, адміністрацыю інтэрната, студсавет аб парушэннях, якія адбыліся ў інтэрнаце.

4. Узаемадзейнічаць з адміністрацыяй інтэрната, студсаветам, прадстаўнікамі органаў МУС па пытаннях сваёй кампетэнцыі.

***IV раздзел. Гарантыі паўнамоцтваў оператрада***

1. Оператрадам інтэрнатаў у ажыццяўленні іх паўнамоцтваў садзейнічаюць адміністрацыя Белдзяржуніверсітэта, прафкам студэнтаў.

***V раздзел. Заахвочванне членаў оператрада***

1. За актыўны ўдзел у рабоце членам оператрада выносіцца маральнае і матэрыяльнае заахвочванне.

# БЕЛАРУСКІ ФОНД СОРАСА

абвяшчае

## КОНКУРС ДАСЛЕДВАННЯЎ ПА САЦЫЯЛЬНЫХ НАВУКАХ

У МЕЖАХ ПРАГРАМЫ «ГРАМАДЗЯНСКАЯ СУПОЛЬНАСЦЬ»

Да ўдзелу ў конкурсе запрашаюцца даследчыкі ў наступных галінах:

**САЦЫЯЛОГІЯ**

- Фарміраванне суб'ектаў грамадзянскай супольнасці
- Сацыяльныя механізмы станаўлення рынкавых адносінаў
- Пераадоленне стэрэатыпаў таталітарызму ў масавай свядомасці

**ПАЛІТАЛОГІЯ**

- Станаўленне дэмакратычных інстытутаў
- Сацыяльна-палітычныя канфлікты
- Знешнепалітычныя прыярытэты Беларусі

**ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ XX СТАГОДДЗЯ**

- Праблема фарміравання эліты беларускага грамадства
- Палітычныя партыі і рухі Беларусі
- Гісторыя прадпрымальніцтва і сацыяльна-эканамічных пераўтварэнняў у Беларусі

*ТЭРМІН РЭАЛІЗАЦЫІ ПРАЕКТУ не павінен перавышаць адзін год.*

ПРАЕКТЫ НЕ МОГУЦЬ НАСІЦЬ камерцыйны характар.

У межах конкурсу НЕ БУДЗЕ ФІНАНСАВАЦЦА выданне рукапісаў і манаграфій.

***Пераможцы конкурсу атрымаюць падтрымку ў выглядзе невялікіх грантаў і тэхнічнай дапамогі на рэалізацыю праектаў.***

АДНА З КЛЮЧАВЫХ УМОЎ падтрымкі праекту - абавязацельства аўтараў азнаёміць як мага больш шырокае кола насельніцтва з вынікамі даследванняў праз выступленні ў сродках масавай інфармацыі і распаўсюджванне інфармацыйна-аналітычных матэрыялаў.

***Тэрмін разгляду заявак - два месяцы з дня заканчэння конкурсу.***

Форму заяўкі і дадатковую інфармацыю Вы можаце атрымаць у Беларускім Фондзе Сораса па адрасу: **220027 г.Мінск, пр.Ф.Скарыны, 65, корпус 11а БДПА, пакой 517а, з 10.00 да 13.00 і з 14.00 да 17.00 у працоўныя дні.**

*Заяўкі, складзеныя не па форме, не прымаюцца.*

***Заяўкі прымаюцца да 27 сакавіка 1996 года.***

*Просім дасылаць іх па пошце на вышэй названы адрас Беларускага Фонду Сораса, з пазнакай* ***«Конкурс даследванняў па сацыяльных навуках».***

© Гольф трим 014

# БЕЛАРУСКІ ФОНД СОРАСА

абвяшчае конкурс

## «ПАДТРЫМКА ПРАВЯДЗЕННЯ СЕМІНАРАЎ І КАНФЕРЭНЦЫЙ»

у межах праграмы **«Грамадзянская супольнасць»**

НА КОНКУРС ПРЫМАЮЦЦА ЗАЯЎКІ на правядзенне семінараў і канферэнцый па наступных напрамках:

- **права**
- **сацыялогія**
- **паліталогія**
- **гісторыя**
- **права чалавека**
- **нацыянальныя і этнічныя меншасці**

*ПРАЕКТЫ НЕ МОГУЦЬ МЕЦЬ камерцыйны, рэлігійны і палітычны характар.*

ЗАЯЎКА ПАДАЕЦЦА НЕ ПАЗНЕЙ чым за 3 месяцы да дня правядзення мерапрыемства.

**Кожны пераможца конкурсу атрымае грант на суму не больш чым 3000 долараў ЗША.**

Заяўкі, складзеныя не па форме, не прымаюцца.

Форму заяўкі і дадатковую інфармацыю Вы можаце атрымаць у Беларускім Фондзе Сораса па адрасу: **220027 г.Мінск, пр.Ф.Скарыны, 65, корпус 11а БДПА, пакой 517а,** з 10.00 да 13.00 і з 14.00 да 17.00 у працоўныя дні.

**Заяўкі прымаюцца да 30 сакавіка 1996 года.**

*Просім дасылаць іх па пошце на вышэй названы адрас Беларускага Фонду Сораса, з пазнакай* **«Конкурс падтрымкі правядзення семінараў і канферэнцый».**

© Гольф трим 011

# *Спіс студэнтаў-стыпендыятаў Фонду Сораса 1995/1996 навучальнага года*

**Біялагічны факультэт**

Баева І.А.
Бяспалаў І.А.
Валатовіч А.А.
Грыбоўская С.М.
Громак Н.В.
Зімянін В.Л.
Някрасаў У.С.
Пятрова К.В.
Сацукевіч Н.У.
Шарапава Т.А.
Юрчанка Я.А.

**Геаграфічны факультэт**

Аляксеева Н.П.
Фалалеева М.А.

**Механіка-матэматычны факультэт**

Бадулін К.А.
Базылеў Д.Ф.
Бялевіч А.У.
Гняздзілаў М.Д.
Дзеравяга С.П.
Калоша М.П.
Кішчанка М.Г.
Крот А.У.
Навумаў А.А.
Ціханаў С.В.

**Фізічны факультэт**

Адамаў Ю.У.
Астаповіч М.У.
Барысенка А.Я.
Варакса І.М.
Воласач С.А.
Гоцін С.В.
Грыгелевіч П.С.
Дадзімаў Д.А.
Дзянісаў А.А.
Дзянісаў І.А.
Драздова А.М.
Зайцаў М.А.
Захараў І.У.
Ісакаў С.Д.
Карпека М.В.
Красоўскі С.У.
Кузьміцкі А.Ю.
Максіменка А.С.
Нігул Л.У.
Післякоў А.У.
Полюх А.Л.
Серы І.В.
Спірыдовіч С.П.
Тарасевіч В.Б.
Ташлыкова І.І.
Хаціловіч В.Г.
Саклакаў А.М. студэнт фізічнага і хімічнага факультэтаў

**Факультэт прыкладной матэматыкі і інфарматыкі**

Васерман Д.І.
Гаўрылаў А.В.
Гафураў С.У.
Герасімовіч А.А.
Гурэвіч С.Д.
Дзмітрук Н.М.
Зяневіч Д.У.
Злобіч С.В.
Казак Д.В.
Кашынская Ю.Ю.
Каштэлян У.Л.
Конанаў А.У.
Кузьмін М.А.
Лапкоўскі В.П.
Луцкіна А.В.
Марцынеўскі А.В.
Мядведзеў Д.Г.
Нарадзецкі Д.А.
Навумовіч Г.М.
Новікаў В.М.
Палонскі Ю.В.
Рабіновіч М.М.
Сінкевіч С.В.
Сокал У.Л.
Спірын М.Г.
Судзілоўскі В.У.
Фрэнкель Д.С.
Харын А.Ю.
Шышкевіч А.А.
Шохан А.Л.
Ядранцаў А.М.

**Факультэт радыёфізікі і электронікі**

Бутовіч А.В.
Марко І.П.
Матыліцкі Ю.У.
Наліўка С.В.
Нячаеў С.У.
Паршын В.В.
Прыслопскі А.Я.
Рассадзін С.А.
Старыковіч М.У.
Трафімаў С.Ю.
Ушакоў Д.У.
Фурунжыеў Р.Р.
Апанасевіч Д.М.

**Хімічны факультэт**

Бей М.П.
Ісакаў У.Я.
Кавалеўскі А.У.
Кулак А.А.
Лахтанаў П.М.
Лысова В.А.
Матусевіч А.А.
Мацюшэнка Я.А.
Астапчык М.К.
Паўлечка Я.У.
Пукін А.В.
Седнеў К.В.
Фядуцін Ю.А.

**Гістарычны факультэт**

Сіцько А.Ю.
Скепьян Н.А.

**Філалагічны факультэт**

Батурчык Н.А.
Важнік С.А.
Капцаў У.А.
Каўрыгіна Т.Н.

**Філасофска-эканамічны факультэт**

Ермалаева С.Б.
Аляксандраў В.Л.
Баркоўскі П.У.
Клебча Т.М.
Марчанкава А.Я.
Семянцова А.І.
Філіповіч А.В.
Шпарага В.Н.

# *Званіце, калі вам патрэбна дапамога*

Часам у кожнага з нас узнікаюць невырашальныя праблемы. І тады здаецца: жыццё спынілася, выйсця няма. Не спяшайцеся падводзіць рысу. Нават са складанага лабірынта ёсць выйсце — можна ўзляцець.

Крыху больш за 11 гадоў працуе ў Мінску служба экстранай псіхалагічнай дапамогі. Думаю, не варта казаць, колькі чалавек дзякуючы ёй пазбавіліся гнятлівых праблем, знайшлі сілы, паверылі ў сябе. Там працуюць людзі, вартыя павагі, не абыякавыя да нашых лёсаў. Расказаць падрабязна аб гэтым я папрасіў псіхолага Галіну Міхайлаўну Сасноўскую.

**— Заглянуўшы ў тэлефонны даведнік, мне ўдалося знайсці толькі адзін нумар вашай службы — 46-11-11. За мяжой, наколькі я ведаю, псіхолагі працуюць ва ўсіх бальніцах, дашкольных і навучальных установах, існуюць лініі даверу для падлеткаў, пажылых людзей, суіцыдэнтаў. А чаму ў нас пра вашу службу ведаюць нямногія?**

— Пра нашу работу часцей за ўсё даведваюцца ад знаёмых, з аб'яў, якія мы развешваем у школах і ВНУ. На жаль, да пэўнага часу лічылася, што ў нашай краіне не бывае ніякіх праблем. Псіхолагі не працавалі так, як зараз. Таму да нас прыходзяць, спадзеючыся на апошні шанц, калі канфлікт абвастрыўся, даў пра сябе ведаць бяссоннымі начамі і абыякавасцю да жыцця. У такіх выпадках дапамагчы вельмі цяжка, і за гэта бярэцца псіхатэрапеўт. Людзі проста прызвычаіліся ўсё трымаць унутры сябе, трываць. Так нельга. Да нас трэба звяртацца, калі ўзнікаюць праблемы, каб своечасова прадухіліць канфлікт і пазбегнуць шматлікіх непрыемнасцяў.

**— Хто часцей звяртаецца да вас, спрабуючы пагасіць назраванне канфлікта?**

— Цяжка сказаць. Напэўна, бацькі, забеспакоеныя сваімі дзецьмі. Прычыны розныя: дзіця невядома адкуль прыносіць дарагія рэчы, не хоча вучыцца, выпівае або курыць, грубіяніць. А раней, кажуць, ён быў харошым хлопчыкам. З-за непаразумення з двух бакоў пачынаецца вайна — хто каго. Даводзіцца тлумачыць, што хлопец вырас і звяртае на сябе ўвагу, спрабуе выдзеліцца і нават стаць самастойным. А калі ў сям'і не заведзена абмяркоўваць паміж сабой свае праблемы, то ад дзіцяці нельга чакаць шчырасці. І калі бацькі гатовыя да вырашэння канфлікту, мы дапамагаем ім у кабінеце псіхалагічнай дапамогі.

**— Спадзяюся, гэта не адзіны кабінет у горадзе?**

— Праканcультавацца можна ў паліклініках №№ 2, 18, 25, 26, 28.

**— Падлеткаў трывожаць сямейныя праблемы?**

— Не менш, чым бацькоў. Кожнае дзіця хоча, каб у доме быў спакой, мілыя тата і мама, якія па-сапраўднаму любяць яго і разумеюць. Як правіла, канфліктную сітуацыю ствараюць абодва бакі, але бацькам не варта забываць, што ў дзіцяці абсалютна іншае ўяўленне аб рэчах, чым у дарослых. Не трэба чакаць ад сваіх малых абдуманых дарослых дзеянняў. Дзеці не абавязаныя разумець нашыя цяжкасці, рэагаваць дабрыней на кепскі настрой, клапаціцца аб нас, калі мы гэтага не рабілі, калі не навучылі іх гэтаму сваім прыкладам.

**— Вас не даймаюць свавольнікі?**

— Бывае, што дзеці звоняць і, хіхікаючы, на хаду прыдумваюць страшныя расказы. Адчуўшы да сябе сур'ёзнае стаўленне, яны кідаюць трубку. Аднак я ўпэўненая, у наступны раз яны пазвоняць, калі ўзнікне сапраўдная праблема. Часам падлеткі звоняць "ад нуды". А пры размове высвятляецца сапраўдная прычына званка: страх ці нейкія сумненні. Мы не размяжоўваем званкі на важныя і несур'ёзныя, стараемся падтрымаць тых, каму патрэбная наша дапамога. Дзяўчына, якая плача ад таго, што не ведае, якую сукенку надзець на вечарынку і спадабацца хлопцу, таксама вартая разумення.

**— У рэкламных газетах нярэдка можна сустрэць аб'яву: "Псіхалагічная дапамога, кансультаванне". У сярэднім за такое "разуменне" можна заплаціць ад 50 да 100 тысяч рублёў, у залежнасці ад складанасці праблемы. Некаторыя даюць кансультацыі, выязджаючы па выкліку. Вас не турбуюць "канкурэнты"?**

— Зараз псіхолагаў рыхтуюць паўсюль: у ВНУ, фірмах, на курсах. Але адна справа — толькі што атрыманае пасведчанне ці дыплом, і іншая — дапамога, заснаваная на вопыце і прафесіяналізме. Дый дапамога, пагадзіцеся, не павінна каштаваць нейкіх грошай.

*Калі Вам стала самотна альбо няма з кім падзяліцца сваімі бедамі, не адчайвайцеся, набярыце нумар 46-11-11 і скажыце: "Добры дзень, мне патрэбная вашая дапамога".*

***Размаўляў Аляксей Максюкоў***

## *ДАІ паведамляе*

У студзені 1996 года па Мінску адбылося 48 дарожна-транспартных здарэнняў, у якіх 4 чалавекі загінулі, а 49 былі параненыя.

Рост парушэнняў Правілаў дарожнага руху назіраецца ў БДУ. Так, не спыніўся на чырвоны сігнал светлафора Раўбута Андрэй Уладзіміравіч. Студэнт Макараў Алег Міхайлавіч, затрыманы 18 студзеня 1996 года, ездзіў без тэхнічнага агляду аўтамашыны. У студэнта юрфака Натабідзе Нукзара Міхайлавіча пры праверцы вадзіцельскіх дакументаў 7 лютага не аказалася талона папярэджання. Такое стаўленне да дарожнай дысцыпліны пацягнула за сабой адпаведныя меры з боку работнікаў ДАІ.

Помніце, што дысцыпліна на дарогах абавязковая для ўсіх удзельнікаў руху.

***Дзяржаўтаінспектар Маскоўскага ДАІ А.Кудраўцаў***

# *Шлюб можа быць розным? Чаму б і не!*

***Гэты матэрыял прадаставілі ў рэдакцыю газеты "Беларускі універсітэт". студэнткі філасофска-эканамічнага факультэта. Тэма, закранутая ў ім, яшчэ некалькі год таму магла лічыцца "клубнічкай". Надышоў, здаецца, час пагаварыць пра гэтую праблему сур'ёзна, грунтоўна.***

Шлюб — адносіны паміж мужчынам і жанчынай, санкцыянаваныя грамадствам. Традыцыйнай формай шлюбу здавён лічылася манагамія — гэта значыць, шлюб аднаго мужчыны і адной жанчыны, афармлены юрыдычна. Яна была асноўнай формай інтымных адносін паміж мужчынам і жанчынай: большасць людзей задавальняла свае сексуальныя патрэбы менавіта ў шлюбе, афармленым юрыдычна.

Працяканне сацыяльных, эканамічных, палітычных працэсаў мяняе і погляд людзей на шлюбныя (у прыватнасці, сексуальныя) адносіны, і іх паводзіны ў гэтай галіне.

У апошнія гады ў нашай краіне адбываліся дастаткова сур'ёзныя перамены ва ўсіх сферах жыцця, якія выклікалі ломку старых стэрэатыпных поглядаў, фармаванне новага светапогляду. З'яўленню новых уяўленняў аб шлюбна-сямейных адносінах спрыяла і паступленне з Захаду вялізарнай колькасці інфармацыі на гэтую тэму праз кнігі, газеты, часопісы, фота- і відэапрадукцыю і г.д. У выніку маладое пакаленне ў сферы сексуальнага жыцця арыентуецца на змяненне нормаў і каштоўнасцей.

Сітуацыя 80-90-х гадоў у гэтай сферы ў нашай краіне нагадвае 60-я ў ЗША. Тады маятнік грамадскіх нораваў ЗША калыхнуўся ад культа пурытанскай стрыманасці і добрапрыстойнасці, характэрных яшчэ для пачатку гэтага стагоддзя, да патрабаванняў цярпімасці і ўседазволенасці ў адносінах паміж паламі, да так званай сексуальнай рэвалюцыі.

Заходнія даследчыкі адзначаюць, што сексуальная рэвалюцыя прывяла да змянення сексуальных нормаў. Глыбокія пачуцці ў дачыненнях паміж сабой сталі разглядацца як прыкмета слабасці. Ну, а каханне ў век сексуальнай рэвалюцыі стала азначаць не больш, чым непажаданую адказнасць у той час, калі "чысты" секс ні да чаго не абавязвае. Расце колькасць пазашлюбных сувязей сярод моладзі.

Сексуальная рэвалюцыя змяніла сітуацыю, прывяла да эратызацыі шлюбу, але адначасова і абясцэніла яго. Палавыя кантакты ператварыліся ў своеасаблівы спорт, пазбаўлены асобаснай далучанасці, абясцэньваецца блізкасць. Росквіт парнаграфіі, рост сексуальнага натуралізму ў белетрыстыцы даваршаюць карціну: уплыў на ўяўленне аказваецца такі, што рэальныя паводзіны здаюцца бляклымі і непрывабнымі. У выніку адбываецца чыста знешняя сексуалізацыя сучаснага чалавека.

Сексуальная рэвалюцыя змяніла ролю жанчыны ў палавым жыцці і ролю палавых адносінаў у жыцці жанчыны. Мужчына ж, прыгнечаны ва ўмовах сучаснага грамадства ростам дарагавізны, няздольнасцю ўтрымліваць сям'ю, аглушаны нервовымі перагрузкамі, пасуе перад новымі памкненнямі жанчыны і выбірае аблегчаны, пасіўны варыянт сексуальных паводзінаў — мяняецца характар дачыненняў паміж паламі.

Эканамічнымі прычынамі тлумачыцца адмова шлюбных партнёраў ад нараджэння дзяцей, бо іх утрыманне і выхаванне патрабуе ўсё больш значных тратаў.

Расце колькасць людзей, якія аддаюць перавагу адзінокаму ладу жыцця, не звязваюць сябе шлюбам. Павялічваецца лік людзей, якія жывуць у юрыдычна не афармленым шлюбе. Многія віды шлюбападобнага сужыцця, якія ў свой час расцэньваліся як амаральныя і нават нелегальныя, цяпер прэтэндуюць на права лічыцца амерыканскай сям'ёй. Таму інстытут сям'і ў ЗША, лічаць спецыялісты, развальваецца, саступаючы месца нейкім дзіўным новаўтварэнням кшталту групавога шлюбу, у якім партнёраў не два, а шмат. Яны прымаюць на сябе ўсе віды адказнасці звычайнага шлюбу.

Іншы прыклад — адкрыты шлюб. У ім дапускаецца сямейная няверхнасць з узаемнай згоды абодвух бакоў. Тэрмін "адкрыты шлюб" нават зацверджаны ў якасці афіцыйнага штогадовай канферэнцыяй Нацыянальнага Савета сямейных адносінаў ЗША. У такі шлюб уступае ўсё больш і больш амерыканцаў. Яго вітаюць і некаторыя спецыялісты-навукоўцы, якія тэарэтычна абгрунтоўваюць вартасці гэтай навінкі. Так, Р.Мазур, аўтар кнігі "Новая блізкасць. Адкрыты шлюб і альтэрнатыўныя жыццёвыя стылі", лічыць, што маральны кодэкс аднашлюбнасці, які высоўвае дом на шляху свабодных праяваў палавых схільнасцей, чужы чалавечай прыродзе і нават вядзе да ўзнікнення неўрозаў. Р.Мазур і яго аднадумцы прызнаюць, што шлюб і сям'я не здольныя задавальняць патрэбу чалавека ў шчасці. Такім чынам, лепшае, што могуць зрабіць супругі адзін для аднаго,— прадаставіць свабоду для пошукаў шчасця па-за шлюбам. Затое дзякуючы гэтаму шлюб, маўляў, захоўваецца як сацыяльны інстытут, які выконвае важныя функцыі (перш за ўсё — узнаўленне, нараджэнне і выхаванне новых членаў грамадства).

Ёсць і такая форма шлюбу як суінгерства. Суінгеры — сямейныя пары, якія практыкуюць абмен жонкамі. Гэтую форму разглядаюць як спосаб зняць манатоннасць аднашлюбнасці.

Апрача таго, у ЗША пачынаюць культывавацца шлюбы паміж гомасексуалістамі.

Яшчэ адным выражэннем індывідуалізму стаў рост пазашлюбнага сужыцця: атрымалі распаўсюджанне так званыя спробныя шлюбы. У гэтай форме шлюбу маладыя людзі не жэняцца, а заключаюць пэўны шлюбны кантракт у канторы якога-небудзь юрыста на некалькі год з правам яго падаўжэння альбо скасавання.

Традыцыйная канцэпцыя шлюбу, якая трымалася на абавязках у дачыненні да дома і сям'і, саступае месца разуменню шлюбу як кантракта, "які ні да чаго не абавязвае і дазваляе партнёрам і ў рамках сям'і заставацца такімі ж аўтаномнымі асобамі, як і раней", як мяркуе амерыканскі прафесар С.Хаўэрвас.

Прыкладам такога "аўтаномнага" разумення сям'і можа служыць яшчэ адна разнавіднасць шлюбу — шлюб з сепаратным (ці асобным) пражываннем супругаў. Ва ўмовах такой сям'і муж і жонка здымаюць кватэры ў розных канцах горада, не бачацца пяць працоўных дзён, па суботах і нядзелях ходзяць адзін да аднаго ў госці. Гэты шлюб не дазваляе супругам надакучыць адзін аднаму.

Р.Мазур да вышэйпералічаных нетрадыцыйных формаў шлюбу дадае яшчэ сінергамны шлюб, блізкі да двайжэнства, двайжужжа, і групавы секс, ва ўмовах якога жанатыя ці нежанатыя пары аб'ядноўваюцца і мяняюцца шлюбнымі партнёрамі.

Амерыканскія сацыёлагі надаюць дастаткова многа ўвагі тэарэтычным і эмпірычным даследаванням сямейна-шлюбных адносінаў, вывучаючы нетрадыцыйныя формы паводзінаў у сексуальнай сферы. Тэарэтычныя пошукі і сацыялагічныя даследаванні паказваюць рэальнае становішча справаў у гэтай галіне жыцця амерыканскага грамадства. Гэтай праблематыцы прысвячаецца мноства артыкулаў у заходняй прэсе, выдаюцца кнігі.

На жаль, тэарэтычных распрацовак айчынных сацыёлагаў па праблеме распаўсюджанасці нетрадыцыйных формаў шлюбу ў нашай краіне практычна няма, як няма і эмпірычных даследаванняў па гэтай праблеме.

Праведзенае намі ўвесну 1995 года сацыялагічнае даследаванне "Стаўленне студэнтаў да традыцыйных і нетрадыцыйных формаў шлюбу і ўзровень інфармаванасці ў сексуальнай сферы" мусіла высвятліць становішча справаў у гэтай галіне. У даследаванні прынялі ўдзел у якасці рэспандэнтаў студэнты ВНУ горада Мінска — Беларускага аграрнатэхнічнага універсітэта, Беларускага дзяржаўнага універсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі, Беларускай акадэміі мастацтваў, Беларускага інстытута правазнаўства, Беларускага дзяржаўнага універсітэта.

**Месца секса ў сістэме жыццёвых каштоўнасцей студэнтаў**

Даваўся пералік каштоўнасцей: цікавая работа, кар'ера, здароўе, секс, грошы, багацце, каханне, камфортны побыт, сябры, забавы, сям'я. Студэнтам прапаноўвалася расставіць гэтыя каштоўнасці адпаведна па ступені значнасці для іх. Безумоўным лідэрам стала здароўе: на першае месца яго паставіла палова студэнтаў. Больш такога аднадушша ў ацэнках значнасці іншых каштоўнасцей не назіралася. Апрача здароўя ў першую тройку найбольш часта выбіраных каштоўнасцей (найбольш значных для студэнтаў) увайшлі каханне і сям'я. Сям'я аказалася больш значнай для жанчын: сярод іх больш тых, хто паставіў яе на адно з першых месцаў. Секс у гэтым ацэначным шэразе займае толькі чацвёртае-шостае месцы, гэта значыць, што ён не з'яўляецца галоўнай каштоўнасцю для студэнтаў ВНУ горада Мінска.

**Стаўленне студэнтаў да традыцыйнага шлюбу**

Пераважная большасць студэнтаў у той ці іншай ступені не пагаджаецца з тым, што традыцыйны юрыдычны шлюб з'яўляецца асноўнай формай інтымных адносінаў паміж мужчынам і жанчынай. Гэта азначае, што інтымныя адносіны ў цяперашні час распаўсюджаныя і па-за традыцыйным, юрыдычна афармленым шлюбам. Гэты факт указвае на змены нормаў і каштоўнасцей у сексуальнай сферы маладога пакалення ў параўнанні са старэйшым.

Аднак, можа быць, юрыдычны шлюб — ужо састарэлая форма адносінаў паміж паламі? Больш за палову апытаных не лічыць так. Пра гэта ж сведчыць і намер значнай большасці маладых людзей уступіць у будучыні ў юрыдычны шлюб. Калі да гэтага ліку дадаць 10% тых, хто ўжо быў у шлюбе на момант даследавання, можна зрабіць выснову, што студэнцкая моладзь арыентуецца на традыцыйны юрыдычны шлюб.

**Стаўленне да сямейнай вернасці**

Крыху больш за палову студэнтаў лічыць, што сямейная вернасць павінна захоўвацца абодвума бакамі: і мужам, і жонкай. Дзесятая частка студэнтаў (яе складаюць адны мужчыны) лічыць, што вернасць павінна захоўваць толькі жонка. Цікава тое, што ніводзін чалавек не адзначыў варыянта захавання вернасці толькі з боку мужа.

Сямейная вернасць не павінна захоўвацца ні мужам, ні жонкай на думку 9% студэнтаў. Гэта ўскосным чынам гаворыць аб свабодзе сексуальных адносінаў і арыентаванасці на нетрадыцыйныя формы шлюбу (у прыватнасці, на адкрыты шлюб).

Тых, каму цяжка было адказаць на гэтае пытанне,— 16%. Гэта людзі, якія ў сваіх поглядах знаходзяцца нібы на раздарожжы паміж традыцыйнымі нормамі ў шлюбных адносінах і альтэрнатыўнымі.

**Стаўленне да набыцця сексуальнага вопыту ў дашлюбны перыяд**

Пераважная большасць студэнтаў лічыць, што мужчыны павінны мець сексуальны вопыт да шлюбу. Палова студэнтаў прытрымліваецца такой жа думкі і ў дачыненні да жанчын.

Высветлілася, што жанчыны больш кансерватыўна настроеныя. Яны значна радзей за мужчын адзначаюць магчымасць сексуальных адносінаў да шлюбу. Больш таго, яны ставяцца да "цнатлівасці" мужчын больш строга, чым да сваёй.

Характэрна, што большая частка тых, каму цяжка было адказаць на гэтае пытанне, складалася з людзей, якія не вызначыліся адносна жанчын. Большая аднадушнасць назіралася ў адказах аб дашлюбным вопыце мужчын. Гэта сведчыць аб прыярытэце мужчын у праве дашлюбных сексуальных зносінаў у грамадскай свядомасці. Сярод студэнтаў асабліва строгімі да жанчыны выявіліся мужчыны.

Наогул, стэрэатыпы сексуальных паводзінаў жанчыны яшчэ захаваліся ў свядомасці ранейшымі, хаця яны не такія ўжо моцныя.

**Партнёр, якому ў інтымных зносінах аддаецца перавага**

У якасці партнёра ў інтымных зносінах большасць аддае перавагу любімаму чалавеку, трэць студэнтаў (пераважна мужчыны) — тому, з кім проста прыемна бавіць час. Кожны чацвёрты адзначае такога партнёра, з якім плануе стварыць сям'ю.

Такім чынам, маладыя людзі выбіраюць сабе сексуальнага партнёра, кіруючыся сваімі жаданнямі і, у значна меншай ступені, нормамі, звязанымі з традыцыйным юрыдычным шлюбам.

**(Заканчэнне ў наступным нумары.)**

**БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ**

Заснавальнік газеты - рэктарат Беларускага дзяржаўнага універсітэта

Мінская паліграфічная фабрыка "Чырвоная зорка" МВПА імя Я.Коласа. 220079, г. Мінск, 1-ы Загарадны зав., 3.

*Газета падпісана ў друк у 12.00.*

*29 лютага*
*Зак. 2002.*
*Т. 1000 экз.*

*220080, Мінск-80, Універсітэцкі гарадок, вул. Бабруйская, 9, паверх 4, пакої 411-412, тэлефон 206827.*

**В.а. рэдактара Т.М. Казак**